Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава”

# *Словы, якія абазначаюць назвы прадметаў – назоўнікі*

(Беларуская мова, 2 клас
(па праграме 3 класа спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні))

Настаўнік-дэфектолаг
Цімашчук Н.А.

**Урок беларускай мовы 2 клас**

**(па праграме 3 класа спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні))**

**Тэма: Словы, якія абазначаюць назвы прадметаў – назоўнікі**
**Задачы:**

- фарміраваць уяўленне пра назоўнік як часціну мовы;
- фарміраваць уменне правільна ставіць пытанні да назоўнікаў;
- садзейнічаць развіццю аналітыка-сінтэтычнага мыслення і зрокавай памяці;
- выхоўваць дабрасумленныя адносіны да працы

**ХОД УРОКА**

**I. Арганізацыйны момант**

Да гасцей ты павярніся
Ім ты шчыра ўсміхніся.
А цяпер за парту сядзь,
Час урок нам пачынаць.

**II.Стварэнне эмацыянальнага камфорту.**

Які прастор... У прасторы іней...
Сама не ведаю, чаму
Люблю я снежныя раўніны
І беларускую зіму!

- А ты любіш зіму?
- Я думаю, мы з табой у добрым зімовым настроі сёння добра папрацуем на ўроку і парадуемся зіме.

**III. Праверка дамашняга задання:**

Давай мы з табой успомнім матэрыял мінулага ўрока
Успомні, з якімі часцінамі мовы мы з табой знаёміліся?
*Знайдзі іх на картачцы.(Картка двайная)*

*Картка 1*

Хлопчык, сябар, назоўнік, школа, урок, прыметнік, вучымся, малюем, дзеяслоў)

Для праверкі
Хлопчык, сябар, **назоўнік**,  школа, урок, **прыметнік**, вучымся, малюем, **дзеяслоў**)

*На дошку вывешваюцца назвы часцін мовы*
Успомні, калі ласка, што такое назоўнік?
(Словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні хто? або што?)
*На дошцы дапаўняецца апора* ***прадмет хто? што?***
Успомні, калі ласка, што такое прыметнік?
(Словы, якія абазначаюць прымету прадмета і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?)
*На дошцы дапаўняецца апора* ***прымета прадмета які? якая? якое? якія?***
Успомні, калі ласка, што такое дзеяслоў?
(Словы, якія абазначаюць дзеянні прадмета і адказваюць на пытанні што робіць? што робяць?)
*На дошцы дапаўняецца апора* ***дзеянні прадмета што робіць? што робяць?***

**Гульня “Часціны мовы”**
На картках запісаны словы, неабходна іх падзяліць на тры групы па часцінах мовы.

Картка 2
*Свеціць яркае сонейка.*
*Шчыпле моцны мароз.*
*Іскрыцца яркі снег.*

**IV. Хвілінка чыстапісання.**

1. **Моўная размінка.**
   **На дошцы** запісаны верш. Прачытаць і ўставіць прапушчаныя літары. Растлумачыць іх правапіс.

Зіма сн.. (я, е)жная прыйшла,
Многа сн..(я, е)гу прынясла:
Сн..(я, е)жкі будзем мы ляпіць,
Бабу сн..(я, е)жную рабіць.

**Пальчыкавая фізкультхвілінка на матэрыяле верша.**
А зараз мы з табой адпачнём і нашы сказы пакажам рухамі (жэстамі).

1. **Чыстапісанне (запісана на дошцы)**
   *с сн снег сняжок*
   *Са снегу лепім снежкі.*

Знайсці аднакарэнныя словы.

**V. Падвядзенне да тэмы ўрока. Знаёмства з новай тэмай**
**Адгадванне загадкі**
Дам я назвы ўсім прадметам,
усім паняццям, розным з’явам
гатоў служыць заўсёды я – вам. (Назоўнік)

Сёння на ўроку мы будзем вучыцца вызначаць назоўнікі сярод іншых слоў і ставіць да іх правільныя пытанні хто? або што?

**VI. Вывучэнне новага матэрыялу.**
**1. Гульня з мячом “Жывы – нежывы”**

Некаторыя назоўнікі адказваюць адказваюць на пытанне хто?, а некаторыя – на пытанне што?
*Апора хто? – вучань, што? – школа.*

**2. Работа з падручнікам**
Пр. 2, с. 3

Чытанне правіла с 3

**Фізкультхвілінка. Гульня “Хто або што”**
Настаўнік называе словы, а вучань выконвае рухі на хто? узмахвае - рукамі, а на што? – прысядае.
*Людзі, пшаніца, жыта, аграном, грузавік, жаваранак, камбайн, рабіна, рыба, дождж, зубр, пчала, кніга, папугай, сабака.*

**3. Самастойная работа**

Заданне на картцы.
Запісаць словы ў два слупкі
Хто?     што?
Бусел, сонца, вучань, маланка, муха, будынак, карова, траўка, часопіс, чалавек, слоўнік, салавей.

4. **Работа з падручнікам**

Пр. 3, с. 5
Прачытаць верш і знайсці назоўнікі, якія адказваюць на пытанне хто?

**VI. дамашняе заданне.**

Пр 6, с. 7

**Рэфлексія**

*Аб чым мы гаварылі на ўроку. Што такое назоўнік? На якія пытанні ён адказвае? Да якіх назоўнікаў ставім пытанне хто? А да якіх што?*

Устань, калі ласка, і мысленна пакладзі на правую дaронь веды, з якімі ты прыйшла на урок, а на левую – тыя веды, якія ты атрымала на ўроку. Якая далонька цяжэйшая? Значыць урок прайшоў не дарэмна. І зрабі так, каб твае веды аб’ядналіся *(Апладысменты .)*

**Выдатна папрацавала. Дзякуй!**

*Картка 1*
Хлопчык, сябар, назоўнік, школа, урок, прыметнік, вучымся, малюем, дзеяслоў)

Для праверкі
Хлопчык, сябар, **назоўнік**, школа, урок, **прыметнік**, вучымся, малюем, **дзеяслоў)**

---

Картка 2

Свеціць яркае сонейка.

Шчыпле моцны мароз.

Іскрыцца яркі снег.

---

**Картка 3**

Зіма сн.. (я, е)жная прыйшла,
Многа сн..(я, е)гу прынясла:
Сн..(я, е)жкі будзем мы ляпіць,
Бабу сн..(я, е)жную рабіць.

---

**Картка 4**

Запісаць словы ў два слупкі
Хто? Што?

Бусел, сонца, вучань, маланка, муха, будынак, карова, траўка, часопіс, чалавек, слоўнік, салавей.

Зіма сн.. (я, е)жная прыйшла,

Многа сн..(я, е)гу прынясла:

Сн..(я, е)жкі будзем мы ляпіць,

Бабу сн..(я, е)жную рабіць.